## Даўгі двароў

З канцом прыгону ў дворнай гаспадарцы пачалі ў нас рабіцца вялікія перамены. Першая — гэта тое, што была скасована дармовая праца сялян, і людзям за работу прыйшлося плаціць гатовымі грашмі, — значыць, на рабочыя рукі пайшла добрая частка даўнейшых даходаў. Поруч з гэтым і гаспадарыць па–старому ўжо было нельга: разьвіцьцё эканамічнага жыцьця, сусьветная канкурэнцыя, дый канкурэнцыя на гарадзкіх рынках мужыцкага збожжа — усё гэта прымушала двары парупіцца аб разьвіцьцё сваей гаспадаркі, каб зямля больш радзіла, каб больш збожжа было на продаж. Ведама: не паклаўшы — ня возьмеш; вось, значыць, трэба было шукаць негдзе грошы на старане, бо пры даўнейшай гаспадарцы па дварох было багата ўсялякага дабра, але грошы мала.

Грошы лёгка знайшліся: іх ахвотне сталі пазычаць банкі пад залог дворнай зямлі. Каб усе прыпазычаныя грошы ішлі на падняцьце і палепшаньне дворнай гаспадаркі, дык яны, зрабіўшы сваё дзела, праз нейкі час бы вярнуліся. Але ж людзі, каторыя пры паншчыне прывыклі да раскошнага жыцьця, пры новых парадках не патрапілі ці не хацелі жыць іначай — таньней, нягледзячы на тое, што з вызваленьнем мужыкоў двары–ткі пабяднелі. З гэтай прычыны ўзятыя з банкаў грошы найчасьцей ня йшлі на тое, на што былі прызначаны, а проста праядаліся.

Ня дзіва пасьля гэтага, што даўгі двароў страшэньне ўзрасьлі. Вось мы тутака даём таблічку, у каторай паказана, колькі ёсьць дворнай зямлі па нашых губэрнях, колькі яе заложана (толькі ў прыватных банках, ня лічачы гасударственага дваранскага банку) і які доўг на ей ляжыць.

| **У губэрнях:** | **Лік дзесяцін дворнай зямлі:** | **Лік дзес. зямлі, заложан. у банках:** | **Колькі даўгу аставалася 1 января 1910 г.** |
|---|---|---|---|
| Віленскай. . . . | 1 532 794 | 759 939 | 24 251 623 руб. |
| Гродзенскай. . . | 1 203 444 | 444 767 | 14 572 581 „ |
| Ковенскай. . . . | 1 728 039 | 615 075 | 25 506 001 „ |
| Мінскай. . . . | 5 256 977 | 2 292 030 | 40 127 813 „ |
| Магілеўскай. . . . | 2 303 740 | 960 872 | 20 881 200 |
| Віцебскай. . . . | 2 134 517 | 854 717 | 21 881 200 „ |
| Усяго разам . . . . | 14 159 511 дзес. | 5 927 400 дзес. | 147 220 418 руб. |

Як бачым з гэтай табліцы, з 14 зь лішкам мільёнаў дзес. дворнай зямлі заложана ў прыватных банках бязмала 6 мільёнаў дзесяцін за *147 мільёнаў рублёў зь лішкам*.

Цыфра доўгу была бы йшчэ вялікшая, каб мы палічылі, колькі панскай зямлі і за якія грошы заложана ў гасударственым дваранскім зямельным банку: у Мінскай губэрні, напрыклад, у гэтым банку заложана 159 двароў (502 тыс. 434 дзес.) за 8 мільёнаў 261 тыс. 525 руб. 73 кап. У Мазырскім павеце зусім няма незаложанай зямлі: тамака пад залогам 99,3 працэнта, а па ўсей Мінскай губэрні заложана 67,1 прац. усей дворнай зямлі.

Праўда, ёсьць у нашай старонцы двары, у каторых пазычаныя грошы ідуць на палепшаньне гаспадаркі, але такіх зусім мала. І хаця доўг памаленьку выплачваецца, сьмела можна сказаць, што мала хто зь цяперашніх паноў здалее выплаціцца банку, і большая частка двароў ці астанецца за банкам, ці пераменіць гаспадароў.